15. Протокол № 10, протоколы регистрации и голосования, стенограмма, бюллетень № 10 десятого заседания 3-й сессии Верховного Совета Республики Беларусь двенадцатого созыва от 11 декабря 1990 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Д. 2857. — 241 л.
16. Протокол № 1, протоколы регистрации и голосования, стенограмма, бюллетень № 1 первого заседания 4-й сессии Верховного Совета БССР двенадцатого созыва от 21 мая 1991 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Д. 2924. — 225 л.
17. Протокол №11, протоколы регистрации и голосования, стенограмма, бюллетень № 11 одинадцатого заседания 4-й сессии Верховного Совета БССР двенадцатого созыва от 30 мая 1991 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Д. 2934. — 250 л.
18. Об организационно-экономической перестройке иностранного туризма в Белорусской ССР: постановление Верховного Совета Белорусской ССР, 7 июня 1991 г., № 852-XII // Ведомости Верховного Совета Белорусской ССР. — 1991. — № 21. — Ст. 299. — С. 79–80.
19. Протоколы № 15–32 заседаний Комиссии по экономической реформе, достижению экономической самостоятельности и суверенитета республики и документы к ним, 10 января — 10 декабря 1991 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Д. 3887. — 133 л.
20. Протокол № 3, протоколы регистрации и голосования, стенограмма, бюллетень № 3 третьего заседания внеочередной 6-й сессии Верховного Совета БССР двенадцатого созыва от 18 сентября 1991 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Д. 2965. — 113 л.
21. О Контрольной палате Республики Беларусь: Закон Республики Беларусь, 13 марта 1992 г., № 1523-XII // Ведомости Верховного Совета Республики Беларусь. — 1992. — № 12. — Ст. 203. — С. 27–33.
22. Протокол № 35, протоколы регистрации и голосования, стенограмма, бюллетень № 35 тридцать пятого заседания 9-й сессии Верховного Совета БССР двенадцатого созыва от 16 апреля 1992 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Д. 3077. — 1–255 л.
23. Протоколы № 33—34 заседаний Комиссии по экономической реформе, достижению экономической самостоятельности и суверенитета республики, 8 января — 5 ноября 1992 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Д. 3888. — 29 л.
24. Протокол № 42, протоколы регистрации и голосования, стенограмма, бюллетень № 42 сорок второго заседания 12-й сессии Верховного Совета Республики Беларусь двенадцатого созыва от 2 июля 1993 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Д. 3231. — Л. 223.
25. Протоколы № 57–75 заседаний комиссии по экономической реформе, достижению экономической самостоятельности и суверенитету республики и документы к ним, 5 января — 7 декабря 1994 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Л. 3890. — 229 л.
26. Протокол № 3 заседаний Счетной комиссии, протоколы регистрации и голосования, стенограмма, бюллетень № 3 третьего заседания 15-й сессии Верховного Совета Республики Беларусь двенадцатого созыва от 21 июля 1994 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Д. 3336. — 80 л.
27. Протоколы № 76–79 заседаний комиссии по экономической реформе, достижению экономической самостоятельности и суверенитета республики и документы к ним, 18 января — 14 мая 1995 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Л. 3890. — 228 л.
28. Протокол № 1, протоколы регистрации и голосования, стенограмма, бюллетень № 1 первого заседания 18-й сессии Верховного Совета Республики Беларусь двенадцатого созыва от 5 сентября 1995 г. // НА РБ. — Фонд 968. — Оп. 1. — Д. 3436. — 196 л.
29. О председателе Комиссии Верховного Совета Республики Беларусь по экономической реформе, достижению экономической самостоятельности и суверенитета республики: постановление Верховного Совета Республики Беларусь, 8 сентяб. 1995 г., № 3871 // Ведомости Верховного Совета Белорусской ССР. — 1995. — № 29. — Ст. 394.— С. 63–64.

**Summary**

Formation and operation of one of the main committees of the Supreme Council of the Republic of Belarus of XII convocation led by L.P. Kozik is considered. Important issue – the development of parliamentarism in modern Belarus is affected. This is especially important that as this subject is still poorly developed today by Belarusian scientists. Scientific research is based mainly on archival materials, which are introduced into scientific circulation for the first time.

25.02.2011

**УДК 947/987**

**А. А. Субоцін**

# АРГАНІЗАЦЫЯ АДПАЧЫНКУ СТАХАНАЎЦАЎ БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1930-х гг.

*Даследуюцца асаблівасці арганізацыі адпачынку як адной са сфер штодзённасці перадавікоў вытворчасці. Выяўлена, што стаханаўцы ў час адпачынку мелі шэраг высакаякасных паслуг — ім выдаваліся пазачарговыя і бясплатныя пуцёўкі на курорты і ў санаторыі, ствараліся спецыяльныя дамы адпачынку, вылучаліся асобныя пакоі для адпачынку ў інтэрнатах і рабочых клубах. Дадзеныя ўмовы стымулявалі павышэнне прадукцыйнасці працы, замацоўвалі статус стаханаўцаў у якасці прывілеяванай катэгорыі.*

У гістарычнай навуцы даследчыкамі ўсё часцей стала закранацца праблема штодзённасці, якая прадугледжвае не толькі апісанне матэрыяльна-бытавога становішча асобных катэгорый насельніцтва пэўнай эпохі, але і аналіз сацыяльнага вопыту і будзённых паводзін людзей. У рамках вывучэння штодзённасці ўвага ўдзяляецца характару ўспрымання быту чалавекам, або, па вызначэнні нямецкага гісторыка А. Людтке, разнастайным спосабам, з дапамогай якіх індывіды і сацыяльныя групы выражаюць свае адносіны да тых ці іншых сфер жыцця [1, с. 83].

У другой палове 1930-х гг. у савецкім грамадстве сярод працоўных узнікла новая сацыяльная група — стаханаўцы. Яны па сваім статусе і матэрыяльным забеспячэнні пераўзыходзілі астатніх рабочых і сялян, вылучыліся ў асобную элітную катэгорыю. Праблема штодзённага жыцця стаханаўцаў з'яўляецца адной з маладаследаваных у гістарыяграфіі. Гісторыкамі савецкага часу, як беларускімі, так і расійскімі, яна даследавалася ў кантэксце пытання заработнай платы рабочых-стаханаўцаў як важнейшага стымулу далейшага павышэння прадукцыйнасці працы і асновы дабрабыту. Прыклады такога падыходу да акрэсленай праблемы прасочваюцца ў 2-м томе акадэмічнага выдання «История рабочего класса Белорусской ССР» [2, с. 259], даследаваннях В. С. Лельчука [3, с. 230], В. А. Казлова і А. В. Хлеўнюка [4, с. 160–167].

У замежнай гістарыяграфіі тэма штодзённага жыцця стаханаўцаў разглядалася прадстаўнікамі сацыяльна-гістарычанага напрамку. Нямецкі гісторык Р. Майер у манаграфіі, прысвечанай феномену стаханаўскага руху, закрануў і некаторыя аспекты штодзённасці яго ўдзельнікаў. У прыватнасці, ён ахарактарызаваў стаханаўцаў як своеасаблівую «касту», якая па сваім матэрыяльным прывілеяваным становішчы была набліжана да прадстаўнікоў улады і ўтварала апору для ўсталявання палітычнага кантролю над дзейнасцю асобных працоўных калектываў ці прадпрыемстваў [5, s. 150]. Думка прывілеяванасці штодзённага жыцця стаханаўцаў закранаецца і ў даследаванні амерыканскага гісторыка Ш. Фіцпатрыка. Аўтар сцвярджае, што матэрыяльнае забеспячэнне гэтай сацыяльнай групы можна ахарактарызаваць як прыклад набыцця працоўнымі людзьмі тых сацыяльна-бытавых прывілей, якімі валодалі пераважна партыйнае кіраўніцтва і інтэлігенцыя [6, с. 126].

Сярод сучасных расійскіх даследчыкаў да праблемы штодзённага жыцця стаханаўцаў звярнулася А. Асокіна пры разглядзе асаблівасцей сістэмы дзяржаўнага забеспячэння ў канцы 1920–1930-х гг. Высокі ўзровень матэрыяльнага забеспячэння стаханаўцаў яна адносіць да традыцый карткавай сістэмы, таму што, нягледзячы на ўсталяванне адкрытага гандлю ў 1935 г., усё ж захоўваўся востры дэфіцыт на некаторыя тавары і паслугі, да якіх мелі доступ стаханаўцы [7, с. 193–194]. З думкай, што стаханаўцы з'яўляліся прывілеяванай катэгорыяй насельніцтва, згаджаецца ў адным з артыкулаў, прысвечаным харчаванню рабочых БССР у міжваены перыяд, беларускі даследчык І. Раманава. Аднак яна не лічыць некаторае паляпшэнне матэрыяльнага становішча перадавікоў вытворчасці сапраўдным паказчыкам якаснага ўзроўню жыцця людзей працы [8, с. 83–84].

У пералічаных даследаваннях штодзённае жыццё стаханаўцаў не разглядалася ў якасці асобнай праблемы і асвятлялася гісторыкамі пераважна ў кантэксце вывучэння эканамічнага развіцця другой паловы 1930-х гг. і асаблівасцей сацыяльна-бытавога забеспячэння насельніцтва. Складовай часткай вывучэння пытання штодзённасці ўдзельнікаў стаханаўскага руху з'яўляецца разгляд асаблівасцей іх адпачынку, дзе меліся свае адметныя рысы, адрозныя ад яго правядзення астатнімі працоўнымі.

*Мэта артыкула* — прасачыць асаблівасці арганізацыі адпачынку стаханаўцаў БССР у другой палове 1930-х гг.

Адпачынак займае значную частку вольнага часу і накіраваны на ўзнаўленне фізічных сіл і падрыхтоўку такім чынам да працы [9, с. 827]. Добраарганізаваны адпачынак у савецкай дзяржаве быў не толькі сродкам узнаўлення сіл для працоўнай дзейнасці, але і фактарам павышэння прадукцыйнасці працы, бо лічылася, што пралетарый, які добра адпачыў, будзе і працаваць з падвоенай энергіяй у параўнанні з яго калегам, які праігнараваў адпачынак [10, с. 125]. Таму адпачынку стаханаўцаў як людзей, што перавыконвалі ў некалькі разоў нормы і павысілі прадукцыйнасць працы, дзяржава надавала асаблівую ўвагу. Пра гэта, напрыклад, сведчыць Пастанова Пленума ЦК КП(б)Б 14–17 студзеня 1936 г. «Практычныя мерапрыемствы па разгортванню стаханаўскага руху ў прамысловасці БССР». У шэрагу эканамічных і палітычных умоў разгортвання руху ў ёй былі вылучаны культурна-бытавыя, сярод якіх — паляпшэнне дзейнасці дамоў адпачынку [11, с. 195].

Падчас адпускоў стаханаўцам звычайна прадастаўляліся пуцёўкі на курорты. Ініцыятар стаханаўскага руху сярод абутнікаў БССР абцяжчык Г. Скабло, напрыклад, правёў свой водпуск летам 1937 г. у Гаграх, стаханавец Мінскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча М. Фельдман — у Кіславодску [12, с. 4]. На курорты для паляпшэння свайго здароўя было накіравана ў снежні 1935 г. 6 стаханаўцаў з Віцебскага лесазавода імя «Праўды»: 2 — у Жалезнаводск, 2 — у Кіславодск і 2 — у Ялту [13, арк. 15]. У некаторых выпадках пуцёўкі на курорты выдаваліся стаханаўцам у якасці прэмій за выдатную працу. Такую прэмію атрымаў ад Прэзідыума Цэнтральнага савета прафсаюзаў БССР стаханавец М. Зобак з Мінскай абутковай фабрыкі [14, с. 3].

Пры арганізацыі курортнага адпачынку асаблівыя клопаты дзяржава праяўляла ў адносінах да жанчын-стаханавак. У пансіянаце імя М. Горкага на паўднёвым беразе Крыма 22 чэрвеня 1936 г. было адкрыта спецыяльнае аддзяленне маці і дзіцяці, разлічанае для адпачынку стаханавак і іх дзяцей ва ўзросце ад 3 да 8 гадоў. Летам 1936 г. з БССР сюды былі накіраваны лепшыя стаханаўкі дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў [13, арк. 167–168]. Такая ўвага да адпачынку стаханавак тлумачыцца не толькі зацікаўленасцю ў стварэнні спрыяльных умоў для ўзнаўлення іх фізічных сіл, але і зменамі, што адбыліся з сярэдзіны 1930-х гг. у сацыяльнай палітыцы, калі ўзмацнілася апека над сям'ёй і мацярынствам з мэтай палепшыць дэмаграфічную сітуацыю ў краіне, і жанчыны-стаханаўкі адны з першых адчулі такую апеку.

Частка пуцёвак для стаханаўцаў прадугледжвала правядзенне адпускоў у Беларусі — у дамах адпачынку, санаторыях, прафілакторыях. Такія пуцёўкі атрымалі за студзень–сакавік 1936 г. 111 рабочых-стаханаўцаў фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» [15, арк. 117]. З лесазавода «Пралетарый» у санаторый «Сасноўка» было накіравана ў снежні 1935 г. 4 стаханаўца [13, арк. 31].

Акрамя рабочых-стаханаўцаў прамысловасці, пуцёўкі атрымлівалі і перадавікі, што былі заняты ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Пераважна гэта былі стаханаўцы з машынна-трактарных станцый. У студзені 1936 г. 9 стаханаўцаў з Дзяржынскай, Капыльскай і Слуцкай МТС былі накіраваны на курор-

ты ў Кіславодск і Звенігарад, а ў дамы адпачынку з гэтых станцый паехала 5 чал. Усяго за студзень 1936 г. на курортах і ў санаторыях з БССР адпачыла 72 стаханаўца — трактарысты і работнікі МТС [16, с. 4].

Стаханаўцы калгасаў і саўгасаў мелі менш магчымасцей у параўнанні з прамысловымі рабочымі і работнікамі МТС адпачываць на курортах ці ў санаторыях. Пацвярджае гэту асаблівасць прадастаўленне пуцёвак у адзначаных гаспадарках сяла, дзе сярод стаханаўцаў іх атрымлівалі тыя, што найбольш вызначыліся ў вытворчасці або паказалі ўсесаюзныя працоўныя рэкорды. З саўгаса «Крынкі» (Віцебскі раён) у лістападзе 1935 г. пуцёўку ў дом апачынку атрымала толькі стаханаўка Башкірава ў якасці прэміі ад Цэнтральнай конкурснай камісіі Наркамсаўгасаў СССР [17, арк. 46]. У тым жа Віцебскім раёне ў снежні 1935 г. ад малпрамтрэста ў дом адпачынку планавалася накіраваць аднаго, самага лепшага стаханаўца [18, арк. 58].

Як правіла, адпачынак стаханаўцаў сельскай гаспадаркі праходзіў у дамах калгасніка. Лёзненскі райвыканкам 25 снежня 1935 г. накіраваў у адзін з такіх дамоў раённага ўзроўню 25 лепшых стаханаўцаў, сярод якіх былі вядомыя на ўсю рэспубліку перадавікі льнаводства — Быкоўская, Пярцова, Кавалёва. Адпачынак стаханавак працягваўся 2 тыдні. Для іх у доме калгасніка арганізоўваліся вечары самадзейнасці, чыталіся даклады аб міжнародным становішчы, па агратэхніцы і жывёлагадоўлі [19, с. 4].

Варта адзначыць, што водпускі на курортах і ў дамах адпачынку маглі праводзіць усе працоўныя БССР. Так, на Віцебскім лесазаводзе імя «Праўды» разам з 6 стаханаўцамі пуцёўкі на курорты атрымалі ў снежні 1935 г. 7 рабочых [13, арк. 15]. Але стаханаўцы, як і ва ўсіх сферах штодзённага жыцця, мелі пры атрыманні паслуг курортна-санаторнага адпачынку пэўныя прывілеі. 15 снежня 1935 г. Прэзідыумам УЦСПС была выдадзена пастанова «Аб парадку прадастаўлення пуцёвак у дамы адпачынку, санаторыі і курорты стаханаўцам». Згодна з ёй пуцёўкі ў адзначаныя ўстановы выдаваліся сярод рабочых у першую чаргу стаханаўцам незалежна ад іх стажу працы на асобным прадпрыемстве і агульнага працоўнага стажу. Астатнія рабочыя маглі атрымаць пуцёўкі толькі тады, калі яны адпрацавалі на адным прадпрыемстве не менш чым 2 гады і мелі агульны вытворчы стаж не менш чым 5 гадоў. Аднак і ў гэтым выпадку пуцёўкі ў першую чаргу выдаваліся лепшым ударнікам і кваліфікаваным рабочым вядучых прафесій [13, арк. 23]. Пастанова паказвае, што парадак выдачы пуцёвак характарызаваўся ярка выражанай дыферэнцыяцыяй, пры якой перавага ў іх атрыманні залежала ў сукупнасці ад вопыту працоўнай дзейнасці, кваліфікацыі і вытворчых дасягненняў. Стаханаўцы выступалі тут як прыярытэтная катэгорыя: ім, каб пазачаргова атрымаць пуцёўкі, дастаткова было наяўнасці толькі апошняга крытэрыю, які вызначаўся іх статусам, атрыманым за ўдасканаленне працы. Гэта сведчыць пра тое, што любы працоўны, які стаў стаханаўцам, за адно гэта званне меў магчымасць доступу да ўсіх бытавых даброт. Арганізацыя адпачынку стаханаўцаў яшчэ раз сведчыць, што іх статус у грамадстве быў прыкладам сацыяльнай мабільнасці, калі для рабочых і сялян за кароткі тэрмін было рэальным стаць прадстаўніком прывілеяванай групы насельніцтва.

Наколькі прывілеяваным было становішча стаханаўцаў у сферы адпачынку паказвае працэдура выдачы пуцёвак на асобных прадпрыемствах БССР. У снежні 1935 г. на заводзе «Інтэрнацыянал» уся вылучаная 31 пуцёўка ў дамы адпачынку дасталася стаханаўцам, на Мазырскім фанерным заводзе «Чырвоны Кастрычнік» сярод 23 пуцёвак, што былі выдзелены для рабочых, стаханаўцы атрымалі 22, на Мінскім станкабудаўнічым заводзе імя Варашылава стаханаўцам выдадзена 2 пуцёўкі ў дамы адпачынку з 3-х запланаваных, на станкабудаўнічым заводзе імя Кірава (г. Віцебск) усе 5 пуцёвак атрымалі рабочыя-стаханаўцы [20, арк. 79, 82, 84, 87]. Пуцёўкі на курорты, у дамы адпачынку і санаторыі выдаваліся стаханаўцам бясплатна, кошт іх аплачвалі прафсаюзы і часткова страхавыя касы асобных прадпрыемстваў і арганізацый.

Адпачынак стаханаўцаў вылучаўся сваёй прывілеяванасцю і праз адкрыццё ў Беларусі спецыяльных дамоў адпачынку, прызначаных менавіта для іх. У лістападзе 1935 г. ЦК Саюза запалкавай і фанернай прамысловасці СССР было запланавана будаўніцтва асобнага дома адпачынку для стаханаўцаў гэтай галіны ў Беларусі [21, с. 4]. 1 чэрвеня 1936 г. быў адкрыты дом адпачынку для стаханаўцаў Барысаўскай запалкавай фабрыкі [22, с. 7–8]. У маі таго ж года за 15 км ад Бабруйска пачалося ўзвядзенне новага дома адпачынку для стаханаўцаў Бабруйскага лесакамбіната [23, с. 4].

У дадатак да курортна-санаторнага адпачынку для стаханаўцаў уладкоўваліся спецыяльныя бясплатныя экскурсіі па гарадах і знакамітых мясцінах СССР. Беларускай канторай таварыства пралетарскага турызму і экскурсій у маі 1936 г. для стаханаўцаў былі вылучаны пуцёўкі на пяцідзённыя экскурсіі: у Ленінград — 25 пуцёвак, у Кіеў — 20 пуцёвак і на Днепрагэс — 10 пуцёвак [24, с. 4]. ЦК Саюза запалкавай і фанернай прамысловасці СССР летам 1936 г. арганізаваў экскурсію 130 стаханаўцам з іх сем'ямі па Волзе па маршруце Горкі — Астрахань. У гэтай экскурсіі прынялі ўдзел і 37 стаханаўцаў з БССР, сярод якіх Ліхавецкі (Рэчыцкі фанерны завод), Каўман (Мазырскі фанерны завод «Чырвоны Кастрычнік»), Голуб (Барысаўская запалкавая фабрыка) і інш. [25, с. 4]. Прафсаюзам работнікаў машынна-трактарных станцый 10 лепшых стаханаўцаў МТС БССР у лютым 1936 г. былі адпраўлены на экскурсію працягласцю 15 дзён па маршруце Мінск — Кіеў — Днепрабуд — Ялта — Сімферопаль. У ліку экскурсантаў былі стаханаўцы Капыльскай, Дзяржынскай, Слуцкай, Рагачоўскай і Мінскай МТС [26, с. 4].

Важную ролю як фактару далейшага разгортвання стаханаўскга руху адыгрывала стварэнне спрыяльных умоў адпачынку ў прамежках часу паміж выкананнем вытворчых абавязкаў на працягу працоўнага тыдня. Так, у канцы 1935 г. на торфазаводзе «Чырвоная Беларусь» для брыгады грузчыкаў торфу быў пабудаваны цёплы барак, уладкаваны для адпачынку пасля працоўнага дня (меўся стол для чыткі газет, кніг, гульні ў шашкі і даміно). Менавіта пасля пабудовы барака брыгада стала працаваць па-стаханаўску і павялічыла прадукцыйнасць працы да 150 % [27, арк. 5]. Такі добра арганізаваны адпачынак, з аднаго боку, задаволіў па-

трэбы ва ўзнаўленні фізічных сіл на працягу працоўнага тыдня, а з другога — стаў моцным стымулам да ўдасканалення працы.

Каб замацаваць станоўчую дынаміку стаханаўскага руху, адміністрацыяй прадпрыемстваў і прафсаюзамі часта арганізоўваліся асобныя кароткатэрміновыя прафілакторыі для адпачынку стаханаўцаў пасля працоўнага дня. Асабліва іх адкрыццё было важным для тых стаханаўцаў прамысловасці, што працавалі не на адным сталым месцы, а на адкрытай мясцовасці, на лесанарыхтоўках ці на здабычы торфу. Прафсаюзнай арганізацыяй Нова-Беліцкага лесакамбіната на зімні сезон 1935–1936 гг. было арганізавана 6 начных прафілакторыяў выключна для стаханаўцаў, кошт забяспечанасці кожнага з якіх на зіму складаў па 10 000 руб. [28, арк. 86]. З 15 студзеня 1936 г. пачалі сваю працу начныя санаторыі для стаханаўцаў-лесарубаў Удзенскага [29, арк. 44] і Полацкага леспрамгасаў. Стаханаўцы ў гэтых санаторыях на працягу 21 дня харчаваліся і адпачывалі. У санаторыях была наладжана культурна-асветная работа [30, с. 4]. На Бабініцкім механізаваным участку Рэчыцкага леспрамгаса з 1 снежня 1935 г. працаваў трохтыднёвы начны санаторый для стаханаўцаў-лесарубаў і возчыкаў, дзе на ўтрыманне аднаго чалавека выдаткоўвалася штодзённа па 15 руб. [31, с. 4]. Гэты санаторый працягваў сваю працу і ў лютым 1936 г., калі ў ім на працягу 30 дзён без адрыву ад вытворчасці адпачывалі лепшыя стаханаўцы ўчастка Гусакоў, Лобан, Бліноў, Астапенка, Кулагін і інш. [32, с. 4]. Дзейнасць падобных устаноў стварала для стаханаўцаў у ходзе вытворчага працэсу такія ж спрыяльныя ўмовы адпачынку, як і падчас правядзення імі водпускаў. Гэта дазваляла перадавікам пастаянна ўзнаўляць свае фізічныя сілы для падтрымкі ўзятых рэкордных тэмпаў працы.

Пасля працоўнага дня адпачынак стаханаўцаў перыядычна арганізоўваўся ў клубах і рабочых інтэрнатах, дзе ім вылучаліся спецыяльна абсталяваныя пакоі. Так, пры клубе Белэнергакамбіната быў арганізаваны спецыяльны пакой адпачынку стаханаўцаў, абсталяваны мяккай мэбляй, кветкамі і патэфонам [33, арк. 12]. У інтэрнаце торфазавода «Грэбнёва» адпачынак стаханаўцаў праходзіў у падобным жа культурна абсталяваным пакоі [27, арк. 45].

Такім чынам, прыклад арганізацыі адпачынку стаханацаў БССР у другой палове 1930-х гг. паказвае, што гэтая сфера штодзённага жыцця таксама з'яўлялася ў шэрагу з эканамічнымі і палітычнымі ўмовамі важным фактарам разгортвання стаханаўскага руху: ад якасці адпачынку залежаў працэс узнаўлення фізічных сіл перадавікоў для далейшага ўдасканалення працы. Таму стаханаўцы атрымоўвалі пазачарговыя і бясплатныя пуцёўкі на курорты і ў санаторыі, уладкоўваліся ў розныя спецыяльна для іх прафілакторыі, асобныя пакоі адпачынку ў клубах і інтэрнатах. Гэтыя паслугі, як і іншыя сацыяльныя даброты, зрабілі стаханаўцаў прывілеяванай катэгорыяй працоўных, а высакаякасны адпачынак яшчэ раз падкрэсліў сацыяльны статус «знатных людзей».

**Литература**


1. *Людтке, А.* Что такое история повседневности? Ее достижения и перспективы в Германии / А. Людтке // Социальная история. Ежегодник, 1998/99. — М. : Росспэн, 1999. — С. 77–100.
2. История рабочего класса Белорусской ССР : в 4 т. / Ин-т истории АН БССР. — Минск : Наука и техника, 1984–1987. — Т. 2: Рабочий класс БССР в годы Великой Октябрьской социалистической революции и построения социализма (1917–1937) / редкол.: М.П. Костюк (отв. ред.) [и др.]. — 1985.
3. *Лельчук, В.С.* Индустриализация СССР: история, опыт, проблемы / В.С. Лельчук. — М. : Политиздат, 1984.
4. *Козлов, В.А.* Начинается с человека. Человеческий фактор в социалистическом строительстве: итоги и уроки 30-х гг. / В.А. Козлов, О.В. Хлевнюк. — М. : Политиздат, 1988.
5. *Maier, R.* Die Stachanov — Bewegung. 1935–1938. Der Stahanovismus als tragendes und verschgrfenfends Moment der Stalinisierung der sowjetischen Gesellschaft / R. Maier. — Stuttgart, 1990.
6. *Фицпатрик, Ш.* Повседневный сталинизм: социальная история Советской России в 30-е годы: город / Ш. Фицпатрик. — М. : Росспэн, 2001.
7. *Осокина, Е.А.* За фасадом «сталинского изобилия» / Е.А. Осокина. — М. : Росспэн, 1999.
8. *Раманава, І.* Рабочы ўжо ўсімі фібрамі сайго існавання зразумеў, што ўсялякая ўлада вораг рабочага класа / І. Раманава // Гістарычны альманах: навуковы гістарычны і краязнаўчы часопіс. — Т. 11 : матэрыялы Міжнар. навук. семінара «Другая сусветная вайна ў калектыўнай памяці беларусаў, літоўцаў, палякаў» / рэд. рада: А. Краўцэвіч і [інш.]. — Гародня — Беласток : Выд-ва Гарадзенскай гарадской арганізацыі рэсп. грамад. аб'яднання «Таварыства Беларускай Школы», 2005. — С. 71–85.
9. *Добренков, В.И.* Фундаментальная социология : в 15 т. / В.И. Добренков, А.И. Кравченко. — М. : Инфра-М, 2006. — Т. 7: Человек. Индивид. Личность.
10. *Денисова, Л.* Отдых в СССР / Л. Денисова // Родина. — 2007. — № 9. — С. 124–125.
11. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК : в 6 т. / Ин-т истории при ЦК КПБ. — Минск : Беларусь, 1983. — 1987. — Т. 3 : 1933–1945 / под ред. Г.Г. Барташевича [и др.]. — 1985.
12. Адпачынак стаханаўцаў // Звязда. — 1937. — 26 жн. — С. 4.
13. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). — Фонд 509. — Воп. 1. — Спр. 48.
14. Пастанова Прэзідыума Цэнтральнага Савета прафсаюзаў БССР і Наркоммясцпрома // Звязда. — 1935. — 18 кастр. — С. 3.
15. НА РБ. — Фонд 4-п. — Воп. 1. — Спр. 10776.
16. Стаханаўцы МТС — на курорты і ў дамы адпачынку // Звязда. — 1936. — 9 студз. — С. 4.
17. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). — Фонд 932. — Воп. 1. — Спр. 349.
18. ДАВВ. — Фонд 932. — Воп. 1. — Спр. 460.
19. Стаханаўцы на адпачынку // Звязда. — 1935. — 27 снеж. — С. 4.
20. НА РБ. — Фонд 265. — Воп. 1. — Спр. 4292.
21. Новыя кватэры, пуцёўкі на курорты стаханаўцам // Звязда. — 1935. — 23 лістап. — С. 4.

22. Стаханаўскім шляхам. — Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936.
23. Дом адпачынку для стаханаўцаў Бабруйскага лесакамбіната // Звязда. — 1936. — 12 мая. — С. 4.
24. Першамайскія экскурсіі стаханаўцаў // Звязда. — 1936. — 6 крас. — С. 4.
25. Экскурсия белорусских стахановцев по Волге // Рабочий. — 1936. — 26 июля. — С. 4.
26. Экскурсія стаханаўцаў МТС // Звязда. — 1936. — 22 лют. — С. 4.
27. НА РБ. — Фонд 277. — Воп. 1. — Спр. 444.
28. НА РБ. — Фонд 509. — Воп. 1. — Спр. 41.
29. НА РБ. — Фонд 4-п. — Воп. 1. — Спр. 8961.
30. Начныя санаторыі для стаханаўцаў-лесарубаў // Звязда. — 1936. — 8 студз. — С. 4.
31. Начны санаторый для стаханаўцаў-лесарубаў // Звязда. — 1935. — 11 снеж. — С. 4.
32. Адпачынак для стаханацаў лясной прамысловасці // Звязда. — 1936. — 9 лют. — С. 4.
33. НА РБ. — Фонд 265. — Воп. 1. — Спр. 4238.

**Summary**

The article considers features of the organization of rest of the Stakhanov followers in the BSSR in the second half of 1930-th. The author has revealed that in this sphere of an everyday life as well as at reception of other social blessings the privileges to the Stakhanov followers, which steels were given to one of development conditions of the Stakhanov movement and a basis for founding of a new elite category of workers.

16.10.2009

**УДК 947/987**

**У. Г. Філякоў**

# БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІЯ КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ СЛАВЯНСКІХ КУЛЬТУР XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*Актуалізуецца тэма развіцця ўзаемасувязей беларускай культуры з культурамі іншых славянскіх народаў, у прыватнасці ўкраінскай, у перыяд пераходу ад феадальных адносін да буржуазных. Паказваюцца заканамернасці і спецыфічныя асаблівасці розных беларуска-ўкраінскіх сувязей, вызначаюцца іх месца і роля ў кантэксце развіцця славянскіх культур.*

Важную ролю ў жыцці грамадства адыгрывае культура. Менавіта яна фарміруе кожную нацыю, узвышае яе, надае ёй непаўторнае духоўнае аблічча ў своеасаблівым групавым партрэце сусветнай цывілізацыі. І гэта зразумела. Культура нацыі — мерка цывілізаванасці народа і разам з тым своеасаблівая генетычная сувязь пакаленняў. Яна ўяўляе складаную шматгалiновую сістэму, якая ахоплівае ўвесь духоўны свет народа, яго свядомасць, сукупнасць перакананняў і поглядаў.

Звяртаючыся да рэчаіснасці, часта апярэджваючы ў сваёй інтуітыўнай форме навуковае пазнанне свету, культура робіць велізарнае ўздзеянне на фарміраванне нацыянальнай свядомасці [1]. Яна становіцца складовай нацыянальна-вызваленчага і дэмакратычнага руху. Пры адсутнасці ў беларусаў, украінцаў, многіх іншых славянскіх народаў сваёй дзяржаўнасці, самастойных форм палітычнага і эканамічнага жыцця культура выступіла як важнейшы аб'яднальны фактар. Яна садзейнічала і забяспечвала захаванне этнічнай самабытнасці, вяла да абуджэння і выспявання нацыянальнай самасвядомасці.

Вывучэнне культуры славянскіх народаў у час пераходу ад феадальных адносін да буржуазных мае вялікае значэнне. Гэта важна для разумення ўласна гістарычнага працэсу, у якім культура з'яўляецца яго часткай і сама актыўна ўдзельнічае ў развіцці грамадскай і нацыянальнай свядомасці. Гэта важна і для разумення ўнутраных заканамернасцей развіцця самой культуры з яе спецыфічнымі асаблівасцямі — ў дадзеным выпадку на этапе пераходу ад культуры народнасці да культуры больш шырокай этнасацыяльнай супольнасці — культуры нацыянальнай, культуры новага часу.

Культура складаецца і развіваецца ў пэўным сацыяльным асяроддзі, яна не можа быць безнацыянальнай і не можа быць без мастацкай свядомасці. З прычыны агульнасці этнічнага паходжання, блізкасці моў, падабенства гістарычных лёсаў славянскія народы маюць шмат агульнага ў сваім развіцці. Гэта ставіць перад даследчыкамі задачу разгляду і агульных заканамернасцей і спецыфічных асаблівасцей гісторыка-культурнага працэсу як комплекснай праблемы ў эпоху фарміравання славянскіх нацый.

Працэс станаўлення нацыянальных культур у славянскіх народаў быў цесна звязаны з тымі зменамі ў сацыяльнай структуры грамадства, што адбываліся ў пераходную эпоху ад феадалізму да капіталізму. Ва ўсіх славянскіх народаў, незалежна ад іх сацыяльна-эканамічнага становішча, ішоў безупынны і паступова набіраўшы моц працэс сацыяльнай дыферэнцыяцыі, адасаблення мелкабуржуазных і буржуазных пластоў, з аднаго боку, і фарміравання шырокіх дэмакратычных колаў у горадзе і вёсцы — з другога.

Нераўнамернасць праяўлення тыпалагічна падобных сацыяльна-эканамічных фактараў у розных славянскіх народаў вяла да таго, што гісторыка-культурныя працэсы ў іх праходзілі розначасова, неаднолькава па характары выяўлення тыповых з'яў